*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

18 КРАСАВІКА 2008 г. ПЯТНІЦА № 74 (26187)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

**«Прамая лінія» па вашых просьбах!**

## БОЛЬ У СУСТАВАХ. АД ЧАГО?

На «прамую лінію» «Звязды» мы запрасілі **загадчыцу неўралагічнага аддзялення Медыцынскага цэнтра МТЗ, кандыдата медыцынскіх навук Святлану Яўгенаўну РОЎДА.** Дарэчы, наша госця ў сваёй медыцынскай практыцы выкарыстоўвае і такі нетрадыцыйны метад, як апітэрапія — лячэнне з дапамогай прадуктаў пчалярства. Пры гэтым дасягаецца паспяховы эфект у лячэнні захворванняў касцёва-мышачнай і перыферычнай нервовай сістэм, сардэчна-сасудзістых паталогій.

***«Прамая лінія» адбудзецца 22 красавіка ў аўторак з 16.00 да 17.30 па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефонах: 8 (017) 287 18 36 (Вольга Шаўко) і 287 18 29 (Святлана Барысенка).***

## «Форменны спрут»

Генеральнай пракуратурай завершана расследаванне «гучнай» крымінальнай справы, у якой фігуруюць паўсотні супрацоўнікаў мытні «Заходні Буг». Як паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі і сувязяў з грамадскасцю генпракуратуры Міхаіл Вавула, пад дахам памянёнай мытні сама меней сем гадоў таму была створана цэлая злачынная арганізацыя. Гэтая крымінальная структура, у якую ўваходзілі не толькі мытнікі, пад выглядам пліткі для ходнікаў незаконна перамяшчала з краін заходняй Еўропы ў Расію бытавую тэхніку, камп'ютары, адзенне і абутак. Паводле звестак пракуратуры, у 2001 годзе «пярэваратні» незаконна прапусцілі праз мяжу Беларусі 319 партый памянёных тавараў. Бюджэту нашай краіны такім чынам была нанесена шкода больш чым на 20 мільярдаў рублёў.

Сярод арганізатараў гэтай аферы, адзначылі ў генпракуратуры, была службовая асоба мытні «Заходні Буг», якой былі добра вядомы слабыя месцы мытнай сістэмы. Менавіта выкарыстоўваючы недасканаласць тэхналогіі мытнага афармлення «хросны бацька пярэваратняў» распрацаваў прынцыпы дзейнасці арганізаваных злачынных груп. Кіруючыся гэтымі «інструкцыямі», нядобрасумленныя мытнікі падмянялі сапраўдныя дакументы на падробленыя і выпускалі грузы ў вольнае абарачэнне. У гэтай аферы былі задзейнічаны паўсотні супрацоўнікаў мытні «Заходні Буг». Праўда, абвінавачванне ва ўдзеле ў злачыннай арганізацыі і хабарніцтва прад'яўлена 24 «пярэваратням». Астатнія 26 мытнікаў, якія ўваходзілі ў «мафіёзны спрут», былі вызвалены ад крымінальнай адказнасці, паколькі добраахвотна прызналіся ва ўсім і актыўна дапамагалі следству. Генеральнай пракуратурай таксама ўнесена прадстаўленне старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта (ДМК). У гэтым дакуменце выказана патрабаванне да кіраўніка ДМК зрабіць работу над памылкамі. Напрыклад, генпракуратура настойвае на тым, каб былі ліквідаваны прычыны і ўмовы, якія садзейнічаюць учыненню памянёных злачынстваў. Кіраўніцтва органаў пракуратуры таксама прапануе разгледзець пытанне аб мэтазгоднасці знаходжання ў мытных шэрагах супрацоўнікаў, якія заплямілі сябе ў карупцыйных аферах, аднак па розных прычынах пазбеглі пакарання.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**




Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

***Добраўпарадкуецца тэрыторыя ля помніка таварнаму паравозу, які ўсталявалі ля сталічнага Палаца культуры чыгуначнікаў. Работы па яго рэстаўрацыі (а пабудаваны ён быў у 1953 годзе) праводзіліся на базе лакаматыўнага дэпо «Мінск».***

**белагропромбанк**
традиции будущего

### Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

**СООБЩАЕТ, ЧТО 28 АПРЕЛЯ 2008 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ.**

*220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.*

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. Об утверждении Положения об Общем собрании акционеров ОАО «Белагропромбанк» и признании утратившим силу Регламента Общего собрания акционеров открытого акционерного общества «Белагропромбанк».

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 16 апреля 2008 года.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения и расчетно-кассовые центры по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 24 апреля 2008 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 8 мая 2008 года.

**Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 228 53 03.**

**КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА**

Тел.: короткий номер 136 (звонок бесплатный на территории РБ), (017) 218 57 77, 8 029 1 985 777 (Velcom), 8 025 9 185 777 (БеСТ), 8 029 8 885 777 (МТС).

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2006 г. № 2. УНП 100693551.

# РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ

## *Дзяржава гатовая адмовіцца ад 12-гадовага навучання ў сярэдняй школе, калі яно акажацца немэтазгодным*

**У 1998 годзе ў Беларусі распачалася школьная рэформа, згодна з якой сістэма агульнай сярэдняй адукацыі пачала пераход да 12-гадовай праграмы навучання. І дзесяць гадоў таму ў грамадстве стаўленне да новаўвядзення было неадназначным. Сёння, калі эксперымент уваходзіць у сваю найважнейшую неабарачальную стадыю, узнікла неабходнасць яшчэ раз супаставіць усе ЗА і СУПРАЦЬ школьнай інавацыі. Менавіта грамадская значнасць пытання, якое датычыцца літаральна кожнага з нас, абумовіла яго абмеркаванне на ўзроўні кіраўніка беларускай дзяржавы.**

Як адзначыў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, адкрываючы нараду па пытанні мэтазгоднасці 12-гадовага навучання ў сярэдняй агульнаадукацыйнай школе, да цяперашняга года школьнікі ў асноўным працавалі ў рамках традыцыйнага навучальнага працэсу. Аднак мы наблізіліся да той мяжы, калі ў масавым парадку трэба будзе ўвесці абсалютна іншую форму навучання — профільную адукацыю ў апошніх класах з павелічэннем тэрміну навучання на адзін год.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў пытаннях школьнай адукацыі вельмі важна ўлічваць не толькі пазіцыю Міністэрства адукацыі, але і меркаванне грамадства. Не сакрэт, што апошнім часам узнікла пэўная напружанасць у сувязі з пераходам да 12-годкі. Многія бацькі не бачаць для гэтага ніякіх сур'ёзных прычын.

Не задаволены тым, што сёння адбываецца ў школе, і сам Прэзідэнт: тэрмін навучання павялічваецца, і ў той жа час дзяцей перагружаюць складанымі праграмамі. «Так з імі намудрылі, што часам не толькі дзеці, але і іх бацькі з вышэйшай адукацыяй не могуць справіцца з задачкамі для 5—6 класа», — абурыўся Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў прысутным на нарадзе прадстаўнікам педагагічных і навуковых калектываў, бацькоўскай грамадскасці, кіраўнікам рэспубліканскіх і абласных органаў кіравання, што ў пытанні адукацыі мы маем справу з дзецьмі. Гэта значыць — з будучыняй краіны. Таму нікога не павінна стрымліваць нават тое, што працэс рэформы зайшоў вельмі далёка і што на пераход да 12-годкі затрачаны вялікія грошы.

«Калі мы пераканаемся, што працягваць гэту рэформу немэтазгодна, што людзі яе не хочуць, а дзяржаве яна не на карысць, то будзем выпраўляць становішча, нягледзячы на выдаткі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы задаў шэраг канкрэтных пытанняў: ці сталі нашы дзеці разумнейшымі і здаравейшымі ад таго, што пайшлі ў школу ў шасцігадовым узросце і правядуць там цэлых 12 гадоў, ці трэба нам нацэльваць усіх дзяцей на паступленне ў ВНУ, як лішні год адаб'ецца на эканоміцы краіны і на стане працоўных рэсурсаў?.. Цікава, што адказы на гэтыя і іншыя пытанні мелі як прыхільнікі, так і праціўнікі 12-гадовага навучання ў сярэдняй школе. Кожны — свае.

Паводле слоў міністра адукацыі Аляксандра Радзькова, 12-гадовае навучанне ў школе — агульнасусветная тэндэнцыя — яно ўведзена ў 169 краінах. Таксама рэформа дазволіць знізіць штодзённую нагрузку на вучняў і ўвесці «пяцідзёнку». Аб правільнасці абранага вектара гаворыць тое, што Беларусь з'яўляецца лідарам на прасторах СНД у галіне адукацыі, а таксама высокі індэкс чалавечага развіцця ў нашай краіне паводле ацэнак ААН. У выпадку ж адмены рэформы толькі на перавыданне падручнікаў давядзецца выдаткаваць 350 млрд рублёў.

Прэзідэнт Акадэміі навук Беларусі Міхаіл Мясніковіч прытрымліваецца іншага пункту гледжання. Так, паводле яго інфармацыі, на Захадзе 12—14-гадовая сярэдняя адукацыя ўведзена з мэтай схаваць даволі сур'ёзнае беспрацоўе. Для Беларусі гэта праблема сёння не актуальная, хутчэй, наадварот: адчуваецца нястача працоўных рук. Згодна з вынікамі сацыялагічнага даследавання, праведзенага Акадэміяй навук, 70 працэнтаў жыхароў сталіцы адмоўна ставяцца да пераходу на 12-годку.

Цікава, што прыкладна аднолькавая колькасць прадстаўнікоў АН Беларусі і экспертаў Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь маюць прэтэнзіі да сучасных школьных праграм. 88,4 працэнта экспертаў ВАК, сярод якіх і прадстаўнікі вузаўскай навукі, выказваюцца супраць пераходу на 12-гадовую форму навучання. Больш за тое, паводле слоў старшыні Камісіі Анатоля Афанасьева, эксперты выказаліся нават за вяртанне да 5-бальнай сістэмы ацэнкі ведаў школьнікаў.

Пра ў асноўным негатыўнае стаўленне да рэформы сярэдняй адукацыі ў грамадстве сведчаць і вынікі фундаментальнага даследавання Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Так, паводле слоў першага намесніка дырэктара Цэнтра Ніны Шпак, прыкладна 65 працэнтаў бацькоў і настаўнікаў выказваюцца супраць пераходу на 12-гадовае навучанне. ЗА — крыху больш за чвэрць апытаных.

Характэрна, што найбольшая колькасць прыхільнікаў 12-гадовай школы — у ліцэях і гімназіях. Іх прадстаўнікі, дарэчы, мелі магчымасць данесці сваю пазіцыю да прысутных на нарадзе.

Неабходнасць развіваць рэформу падтрымаў і рэктар галоўнай ВНУ краіны, экс-міністр адукацыі Васіль Стражаў. Аднак аргументы апанентаў былі не менш, а часам і больш важкімі: 12-гадовае навучанне ў школе — неапраўдана вялікі тэрмін, які прывядзе не да павелічэння багажу ведаў, а да паніжэння ўзроўню школьных ведаў, развіццю ўтрыманства і інфантылізму; звязаная з 12-годкай профілізацыя навучання арыентавана не на спрыянне маладым людзям у атрыманні будучай прафесіі, а на нацягванне пэўнай групы на паступленне ў ВНУ; педагагічныя калектывы, пры вызначэнні профілю навучання, будуць зыходзіць не столькі з рэальных патрэб рынку працы, колькі з уласных магчымасцяў і інтарэсаў; сам пераход на 12-гадовае навучанне канцэптуальна і арганізацыйна не адпрацаваны; першапачаткова ідэя ўвядзення 12-годкі тлумачылася неабходнасцю зніжэння інтэнсіўнасці вучэбнай нагрузкі, на справе ж прывяла да істотнага ўзрастання напружанасці вучобы; павялічваецца матэрыяльная нагрузка на сем'і па ўтрыманні школьніка-12-класніка, які ў выніку можа так і не наблізіцца да атрымання прафесіі...

Тое, што сёння ў сярэдняй школе не ўсё ў парадку, пацвердзіў сваім выступленнем і віцэ-прэм'ер Аляксандр Косінец. Апошнім часам нават узнік новы, дагэтуль невядомы дыягназ — сіндром школьніка. Поўнасцю здаровымі з'яўляюцца толькі 30 працэнтаў вучняў сярэдніх школ. У той жа час 10 працэнтаў маюць хранічныя захворванні.

Даволі гарачую атмасферу нарады некалькі змякчыў сваім выступленнем першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Анатоль Рубінаў. Паводле яго слоў, не варта ўспрымаць контраргументы праціўнікаў 12-гадовай формы навучання як нейкі папрок Міністэрству адукацыі. На самай справе за апошні час і самім ведамствам, і яго кіраўніком зроблена вельмі многае. Аднак памылкі на дадзеным этапе недапушчальна.

Выслухаўшы часам дыяметральна процілеглыя пазіцыі наконт школьнай рэформы, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, на жаль, адмоўных момантаў новая сістэма мае больш, чым станоўчых. На яго думку, не варта пераўтвараць сярэднюю школу ў падрыхтоўчую базу для паступлення ў ВНУ. У той жа час пытанні на ўступных экзаменах павінны адпавядаць школьнай праграме.

На думку кіраўніка дзяржавы, аптымальны тэрмін навучання ў школе — 11 гадоў. Прычым бацькі самі павінны мець магчымасць выбраць, у 6 ці ў 7 гадоў пасадзіць дзіця за парту. Міністэрству адукацыі, іншым зацікаўленым ведамствам неабходна працягваць работу над удасканаленнем праграм навучання і падручнікаў. Да гэтага працэсу абавязкова падключыць педагогаў-практыкаў. Таксама неабходна завяршыць пераход на пяцідзёнку. Адказнасць за недапушчэнне перагрузкі школьнікаў Аляксандр Лукашэнка ўсклаў персанальна на прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага.

Разам з тым, паводле слоў Прэзідэнта, канчатковае рашэнне па лёсе 12-гадовага навучання ў сярэдняй школе не прынята. Аляксандр Лукашэнка даручыў Анатолю Рубінаву стварыць адмысловую групу з прыцягненнем зацікаўленых асобаў як сярод праціўнікаў, так і з ліку прыхільнікаў школьнай рэформы. Спецыялісты павінны вывучыць замежны вопыт, станоўчыя і адмоўныя моманты прапануемых новаўвядзенняў, папрацаваць з настаўнікамі, бацькамі школьнікаў і прыйсці да нейкага адназначнага, магчыма, кампраміснага рашэння. Кропкі над «і» ў пытанні 12-годкі павінны быць расстаўлены да канца мая. Хутчэй за ўсё, гэта будзе нават не пратакол даручэнняў Прэзідэнта, а заканадаўчы акт.

**Сяргей ПРОТАС.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ТРЫБУШЫЦЕЛЬ ТРУБАПРАВОДА

**Асуджаны віноўнік экалагічнай катастрофы, якая здарылася ў лістападзе 2006 года паблізу вёскі Багданава Сенненскага раёна.**

У Генеральнай пракуратуры нагадалі, што тады на ўчастку магістральнага прадуктаправода, які належыць расійскаму прадпрыемству «Захад—Транснафтапрадукт», адбыўся выкід на прылеглую тэрыторыю амаль 415 тысяч літраў саляркі. Была выяўлена незаконная ўрэзка ў трубаправод, зробленая для крадзяжу дызпаліва. Праз некаторы час быў знойдзены і трыбушыцель трубаправода. Ім аказаўся 28-гадовы жыхар Оршы. Разам са сваім хаўруснікам, асоба якога не ўстаноўлена, ён зрабіў адтуліну ў нафтаправодзе, праз якую зламыснікі «выдаілі» 3 тысячы літраў дызпаліва. Зладзеі сяк-так залаталі прабоіну і зніклі. А праз тыдзень менавіта ў месцы іх урэзкі ў трубу і ўтварыўся «фантан», а потым цэлая сажалка саляркі. Нядаўна адбыўся суд, які прыгаварыў трыбушыцеля трубаправода да 2-х гадоў папраўчых работ з утрыманнем у даход дзяржавы 20 працэнтаў заробку і штрафу ў памеры 7 мільёнаў рублёў. З абвінавачваемага таксама спагнана больш за 84 мільёны рублёў у якасці кампенсацыі прадпрыемству «Захад—Транснафтапрадукт».

### ПАВЕТРАНЫЯ ІНСПЕКТАРЫ

У гэтыя выхадныя дні кантроль за рухам па асноўных магістралях краіны будзе ажыццяўляцца як на зямлі, так і з вышыні птушынага палёту. Паводле звестак Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны, два верталёты, аснашчаныя прыладамі фота-відэафіксацыі, будуць ажыццяўляць патруляванне наступных аўтамагістраляў: «Мінск — Брэст», «Мінск — Гродна», «Мінск — Магілёў», «Мінск — Слуцк», «Мінск — Віцебск», «Мінск — Калачы — Мядзел», «Слабада — Навасады». У выпадку выяўлення парушэнняў паветраныя інспектары будуць паведамляць бліжэйшым нарадам дарожна-патрульнай службы, якія неадкладна выедуць на месца і прымуць меры да непаслухмяных вадзіцеляў. Апроч таго, у суботу і нядзелю, як запэўнілі ў Дзяржаўтаінспекцыі, будзе ўзмоцнены таксама наземны кантроль на найбольш ажыўленых дарогах краіны.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

**Надвор'е**

### ЗНОЎ ДАЖДЖЫ ПЛЮС ЗАМАРАЗКІ ЎНАЧЫ

**Сёння на большай частцы краіны чакаюцца дажджы, а тэмпература паветра ўдзень 6—11 градусаў, па Брэсцкай вобласці да 13 цяпла, — паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.**

Халоднае і дажджлівае надвор'е захаваецца і ў выхадныя. У суботу месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай слабы туман. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 1 градуса да 5 цяпла, удзень — плюс 7—14 градусаў. У нядзелю невялікія дажджы будуць назірацца толькі ў паўднёвай палове краіны. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, удзень — 8—15 цяпла. У пачатку наступнага тыдня захаваецца воблачнае і месцамі дажджлівае надвор'е.

**Сяргей КУРКАЧ.**

СТРАВИТА
страховое предприятие

## ГОДОВОЙ БАЛАНС за 2007 год республиканского дочернего унитарного страхового предприятия «Стравита»

*220037, г. Минск, пер. Козлова, 7. Тел./факс: (8017) 245 16 99 УНП 806000046*

*тыс. руб.*

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **Основные средства** | 7406537,2 | **Источники собственных средств — всего,** в том числе: | 2734042,5 |
| **Нематериальные активы** | 75286,4 | уставный фонд | 1117940,8 |
| **Финансовые вложения — всего,** в том числе: | 23298087,1 | резервный фонд | 132949,0 |
| инвестиции в дочерние общества | — | добавочный фонд | 1439743,6 |
| инвестиции в другие организации | 913,5 | фонд накопления | — |
| облигации и другие долговые обязательства | 23297173,6 | фонд потребления | — |
| | | целевое финансирование | — |
| прочие финансовые вложения | — | нераспределенная прибыль прошлых лет | — |
| **Доля перестраховщиков в страховых резервах** | — | нераспределенная прибыль отчетного года | 43409,1 |
| **Дебиторы — всего,** в том числе: | 66058,4 | **Страховые резервы и фонды — всего,** в том числе: | 48906466,4 |
| дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | 1056,0 | страховые резервы | 48885420,1 |
| | | фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 1344,5 |
| депо премий по рискам, принятым в перестрахование | — | гарантийные фонды | 19701,8 |
| дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 65002,4 | **Кредиторы — всего,** в том числе: | 6091407,8 |
| | | кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования | 5378,8 |
| **Прочие активы — всего,** в том числе: | 27288458,2 | кредиторская задолженность по операциям перестрахования | — |
| незавершенное строительство | — | депо премий по рискам, переданным в перестрахование | — |
| материальные ценности и затраты | 235793,8 | | |
| денежные средства | 27052664,4 | заемные средства | — |
| собственные акции (доли) | — | кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 6086029,0 |
| Прочие активы | — | | |
| **Непокрытые убытки прошлых лет** | — | | |
| **Непокрытые убытки отчетного года** | — | **Прочие пассивы** | 402510,6 |
| **БАЛАНС** | 58134427,3 | **БАЛАНС** | 58134427,3 |

## ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ за 2007 год

*тыс. руб.*

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| **1. Страхование жизни.** | | |
| Страховые взносы (премии) | 010 | 20 882 497,7 |
| Страховые выплаты | 020 | 2 895 054,8 |
| Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -) | 030 | - 23 542 734,7 |
| Отчисления в фонд предупредительных мероприятий и гарантийный фонд | 040 | 218 087,6 |
| Расходы на ведение дела | 041 | 1 953 259,6 |
| Результат от операций по страхованию жизни (+ или -) | 050 | - 7 726 639,0 |
| **II. Страхование иное, чем страхование жизни.** | | |
| Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование | 064 | — |
| Изменение резерва незаработанной премии — нетто перестрахование (+ или -) | 067 | — |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто перестрахование | 082 | — |
| Изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+ или -) | 092 | — |
| Изменение других технических резервов (+ или -) | 100 | — |
| Изменение иных страховых резервов (+ или -) | 105 | — |
| Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды | 110 | — |
| Расходы на ведение дела | 120 | — |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 121 | — |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 122 | — |
| Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -) | 130 | — |
| **III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II** | | |
| Операционные доходы | 140 | 3 869 551,9 |
| Операционные расходы | 145 | 24 430,5 |
| Внереализационные доходы | 150 | 5 325 737,5 |
| Внереализационные расходы | 155 | 300 949,2 |
| **Финансовый результат** | 157 | 1 143 270,7 |
| Использовано прибыли | 158 | 1 099 861,6 |
| Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -) | 170 | 43 409,1 |

**Директор** **О.А. Корота**

**Главный бухгалтер** **В.И. Довнар**

Достоверность годового баланса и отчета о финансовых результатах РДУСП «Стравита» за 2007 год подтверждена заключением аудиторской организации ОДО «Промаудит» (специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0061721 от 03.02.2004 г., выданная Министерством финансов Республики Беларусь со сроком действия по 02.02.2009 г.).

**Заключение аудиторской организации ОДО «Промаудит»:**

«.... проведенный аудит дает достаточные основания для выражения аудиторского мнения о достоверности во всех существенных отношениях бухгалтерской (финансовой) отчетности РДУСП «Стравита» и соответствии совершенных им финансовых (хозяйственных) операций законодательству Республики Беларусь.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность РДУСП «Стравита» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2008 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2007 год».

26.02.2008 г.

**Директор ОДО «Промаудит»** **А.В. Анисович**

**Руководитель аудиторской группы** **И.А. Бич**

### УП «Минский городской центр недвижимости» (продавец) совместно с ИМНС по Советскому району г. Минска

проводят открытый аукцион по продаже подземного хранилища, пристроенного к подвалу ООО «Белкоминвест», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Я. Коласа, 45, к. 1, общей площадью 107 кв.м. Начальная цена составляет 199 520 000 рублей. Отвод земельного участка будет произведен Минской городской землеустроительной и геодезической службой. Объект продается без условий. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона. Аукцион состоится 30 апреля 2008 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления и необходимые документы принимаются по 29 апреля 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 6.

**Контактные телефоны: 227 40 22, 227 48 36.**

УНП 190398583

### УП «Минский городской центр недвижимости»

**ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже конфискованного имущества: двухкомнатная квартира № 127, расположенная по адресу: г. Минск, проспект Машерова, д. 76 (общая площадь — 46,9 кв. м, жилая площадь — 26,8 кв. м).

Начальная цена снижена и составляет 213 132 690 белорусских рублей.

Задаток в размере 21 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. **Аукцион состоится 08 мая 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.** Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 07 мая 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6. Порядок подачи заявлений на участие в аукционе и порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона. Извещение о предыдущих торгах опубликовано в газете «Звязда» от 11.01.2008.

**Телефоны для справок: (017) 227 48 36, 227 40 22.**

УНП 190398583

**Камандзіроўка па пісьму**

# ВЯСКОВЫ «БІЗНЭС-ПЛАН»

**Гэта пісьмо прыйшло ў рэдакцыю газеты «Звязда» па электроннай пошце. Пад ім стаяць 162 подпісы. Пісьмо было выклікана рашэннем Рагачоўскага райвыканкама спыніць гаспадарчую дзейнасць у вёсцы Шапчыцы і знесці там малочную ферму. Змест пісьма — не скарга, а прапанова, прычым са спробай эканамічнага абгрунтавання: замест зносу фермы — яе рэканструкцыя. Падпісаліся жыхары названай вёскі. Пагадзіцеся, што памкненне людзей адрадзіць гаспадарку ўжо само па сабе выклікае павагу. Тым больш, калі яны для гэтага прапануюць нешта канкрэтнае. Карэспандэнт «Звязды» адправіўся ў Рагачоўскі раён высветліць, як да вясковага «бізнэс-плана» аднеслася кіраўніцтва раёна.**




**На спадарожнікавым фотаздымку бачна, колькі заліўных лугоў у пойме Дняпра знаходзіцца побач з Шапчыцамі.**

*Узята з пошукавай сістэмы GOOGLE.*

### ВОСТРАЎ НЕШАНЦАВАННЯ

Малочнатаварная ферма ў Шапчыцах да параўнальна нядаўняга часу не проста існавала — яна была асновай і гонарам калісьці лепшай у раёне гаспадаркі — саўгаса «Бальшавік» (пазней Камунальнае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Званец»).

«Старыя людзі апавядалі, — сказана ў лісце, — што яшчэ да ўвядзення машыннай дойкі ферма здавала штодня да 5 тон малака!» Сёння яшчэ засталіся сведчанні былых «залатых часоў»: садок з басейнам, асфальтаваныя дарогі, водаправод і даволі вялікая, пакуль яшчэ, колькасць дзяцей (толькі ў садку іх — 30). Але сёння ў Шапчыцах працаваць няма дзе. Паводле даных Званецкага сельвыканкама, з 211 чалавек працаздольнага ўзросту, якія пражываюць у Шапчыцах, у КСУП «Званец» працуе толькі 31 чалавек.

Ракавым стаў 1997 год, калі нязменны на працягу апошняй чвэрці стагоддзя старшыня саўгаса Леанід Фралоў (ніводнага разу за гэты час гаспадарка не была стратнай) пайшоў на пенсію. За наступныя 10 гадоў змянілася такая ж колькасць кіраўнікоў — дзесяць…

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.04.2008 г. (для б/н разлікаў)*

1 долар ЗША ............ 2 143,00
1 еўра ............ 3 419,16
1 латвійскі лат ............ 4 907,26
1 літоўскі літ ............ 989,61
1 чэшская крона ............ 136,78
1 польскі злоты ............ 996,67
1 расійскі рубель ............ 91,70
1 украінская грыўня ............ 437,79

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

USD ............ 23,3703
10 UAH ............ 46,7462
1000 BYR ............ 10,8908
EUR ............ 37,2336

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 17.04.2008 г.)*

USD ............ 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

08074>

9 771990 763008

## ПАНЯДЗЕЛАК, 21 КРАСАВІКА

5.25 Дак. серыял «Зоркі кіно».
6.20, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!»
6.45, 7.45, 18.50, 0.50 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
7.30, 8.25 «Дзелавое жыццё».
8.20 Гатуем разам.
8.30 У свеце матораў.
9.05 Фігуры.
9.35 Здароўе.
10.00 Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**11.05, 17.40 Серыял «Сэрцу не загадаеш».**
**12.10 Камедыя «Старая сяброўка».**
14.05 Дак. цыкл «Нябачны фронт».
14.30 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.00 Час кіно.
16.30 ЕўраФэст. Дзень за днём.
**16.45 Серыял «Родныя людзі».**
19.35 Час спорту.
20.00 Ток-шоў «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
**21.45, 0.55 Серыял «Лічбы».**
**22.45 Драма «Апошняя вайна».**

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 «Дыханне планеты».
10.40 «Ералаш».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25, 3.20 Навіны спорту.
11.10 «Жарт за жартам».
12.00 «Малахаў+».
**13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
14.10 «Гадзіла».
14.30 «Кантрольная закупка».
**15.05 Серыял «Дачка садоўніка».**
16.15 VI Нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь-2008. Мінская вобласць».
**18.20 Серыял «Шчаслівыя разам».**
18.55 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.05 Ток-шоў «Выбар».
**22.00 Серыял «Выклік-2».**
23.30 «Злачынствы стагоддзя».
0.05 «Прыгоды геніяльнага аферыста».
1.00 «Бразільскі футбол на АНТ».
*3.30—5.00 Тэхнічная прафілактыка.*
5.05 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.

6.45, 14.30 Мультсерыял «Звычайны Норман».
7.10 «Ранішняя падзарадка».
8.10, 16.00 «Смачна з Барысам Бурдой».
8.40 Невытлумачальна, але факт.
9.30 У гэты дзень.
9.35, 16.35 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
10.20 Святло далёкай зоркі. Эраст Карповіч.
**10.50, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».**
11.45 Добрыя навіны.
12.15 Усё аб бяспецы.
12.45 Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
13.15 «Школа рамонту».
14.10 Тэлебарометр.
14.55 Пазакласная гадзіна.
15.05 Нянька спяшаецца на дапамогу.
18.35 Навіны культуры.
**18.50 Серыял «Я целаахоўнік. Кілер да юбілею». 1-я серыя.**
20.00 Калыханка.
20.20 Беларуская часінка.
21.25 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
22.25 Хакей. Формула гульні.
22.55 Бокс. Мігель Анхель Кото —Альфонса Гомес.

ТВ РЕН

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.45 «Вялікае снеданне».
**8.25, 16.50 Серыял «Афрамасквіч».**
9.00 «Тыдзень».
10.00 «Спартыўны тыдзень».
10.40 «Наш дом».
11.00 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**11.10 Серыял «Рэбека».**
**12.00, 18.25 Серыял «Танга ўтраіх».**
12.50 «Наша справа».
13.00 «Ёсць кантакт».
13.50 «Народжаныя ў СССР».
14.30 «Культурнае жыццё».
**15.00 Серыял «Элен і сябры».**
15.30, 23.00 «Крутыя рабяты».
16.00 «Іх называлі «СМЕРШ».
17.30 «Званая вячэра».
20.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малы».
**20.30 Маст. фільм «Фота маёй дзяўчыны».**
22.55 «СТБ-спорт».
**23.10 Серыял «Баец».**
0.00 «Закон і крымінал».
0.05 «Сталічны футбол».
0.35 «Гучная справа».
**1.25 Серыял «Насланнё».**
**2.15 Маст. фільм «Ход каралевай».**

5.00, 6.15, 7.00, 1.15 Садружнасць live.
**5.30, 14.30 Серыял «ОБЖ».**
6.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00 Навіны Садружнасці.
6.45 Камерцыйная праграма.
7.30 «Мар, дзейнічай, будзь!».
8.00 «Разам».
9.15 «Ведаем рускую».
10.15 «Дзень пасла».
**10.30 Серыял «Дзікі месяц».**
11.30 Дак. серыял «Дзіўнае жыллё».
12.15 Студыя 60х90.
**12.25 Маст. фільм «Ускраіна».**
14.15 «Вучым англійскую».
15.25, 0.15 Дак. серыял «Самыя дзіўныя святы свету».
16.25, 1.40 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.25, 2.30 «Лепшае з Джэнтльмен-шоў».
18.25 Акцэнты.
**18.45 Серыял «Прынцэса і жабрак».**
19.45 «Цік-так».
20.00 «Агульны інтарэс».
20.30 «Рэспубліка сёння».
20.45 «Суседзі».
**21.25 Серыял «Чорны спіс».**
**22.25 Маст. фільм «Ускраіна».**

ВосьМой

7.00, 10.50, 18.10, 22.55 «Навіны кіно».
7.10 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
7.25, 21.05, 23.35 «Метэапрагноз».
**7.30 Маст. фільм «Праклён мёртвага возера».**
8.55 «К-гульні».
9.00 «Клуб-700».
9.30 «К-відэа для дзяцей».
9.50 Дак. серыял «Стратэгія перамогі».
**11.00 Маст. фільм «За бортам».**
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 Мультпарад.
17.00 «Фантастыка і прыгоды».
**18.20 Серыял «Справядлівая справа».**
19.10 «Мой любімы гадаванец».
19.25, 21.10 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
**19.30 Серыял «Лейтэнант Каломба».**
20.45 «Вечарніца».
21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
**21.15 Маст. фільм «Практычная магія».**
**23.05 Серыял «Духі продкаў».**

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**7.15 Меладрама «Рэпартаж».**
9.05 «Ён мог стаць першым».
10.00 «Рэвізор».
10.30 «Спецыяльны карэспандэнт».
11.00 «Сумленны дэтэктыў».
11.30 «Кнот».
**12.55 Серыял «Чужыя тайны».**
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
**14.20 «Кулагін і партнёры».**
14.55 Суд ідзе.
**15.50 Серыял «Рамэо і Джульета».**
